**С. Вярбіцкі**

# ПРАСАДЫЧНАЯ СТРУКТУРА АЦЭНАЧНЫХ ВЫКАЗВАННЯЎ У НЯМЕЦКАМОЎНАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ ПРАМОВЕ

Мэтай работы стала вылучэнне акцэнтных асаблівасцяў ацэначных выказванняў у прамовах немецкамоўнага палітыка. Пад ацэначнымі выказваннямі разумеюцца выказванні, якія надаюць аб’екту ацэнку па параметры “добра” ці “дрэнна”. Матэрыялам паслужылі 10 прамоваў Федэральнага прэзідэнта Федэратыўнай Рэспублікі Германіі Франка-Вальтара Штайнмаера. Аб’ём выбаркі склаў 102 фразы. Прамовы і іх транскрыпты былі ўзятыя з афіцыйнага сайта bundespräsident.de. Прадметамі прамоваў з’яўляюцца звяртанні да памятных дзён, віншаванні.

Ацэначныя выказванні ў прамовах з’яўляюцца не вельмі ўжывальнымі (13 % ад агульнай колькасці выказванняў выбаркі). Яны маюць пазітыўную афарбоўку, што абумоўлена мэтай палітычнай прамовы – павіншаваць і падкрэсліць поспехі. У выбарцы не выяўлены выпадкі выказванняў, калі ацэнка рэалізавана ацэначнымі прэдыкатывамі *gut/schlecht*. Пазітыўнасць вызначаецца семантыкай лексічных адзінак, якія ўваходзяць у склад выказванняў, альбо дзякуючы параўнанню ці метафарам, што ўказваюць на пазітыўнасць з’явы.

Семантыка ацэнкі не ўплывае на тэмп маўлення, ён не адрозніваецца ад выказванняў без ацэначных паказчыкаў. Сярэдні тэмп безацэначных выказванняў складае 4,3 скл/сек, сярэдні тэмп ацэначных выказванняў – 4.5 скл/сек. Сярэдняя колькасць складоў у рытмічным такце ацэначнага выказвання складае 6 складоў, у безацэначным выказванні – 5,9 складоў. Напрыклад: *Wir haben den `Fall*$^{\text{5 скл/сек}}$ *des Eisernen `Vorhangs*$^{\text{5 скл/сек}}$ *in Europa* ***ge``feiert,***$^{\text{7 скл/сек}}$|$^{\text{1,3 сек}}$ *wir|* ***profi`tieren*** *von*$^{\text{4 скл/сек}}$ *offenen `Grenzen*$^{\text{5,5 скл/сек}}$ *und `arbeiten*$^{\text{4,5 скл/сек}}$|$^{\text{0,6 сек}}$ ***als gute `Nachbarn→***$^{\text{4 скл/сек}}$ *in der Europäischen U`nion* $^{\text{8,1 скл/сек}}$ *zu```sammen.*$^{\text{6 скл/сек}}$ .

Вызначана, што пазітыўнааацэначная лексема не заўсёды з’яўляецца акцэнтнай: *Dieses `Denkmal* $^{\text{4,4 скл/сек}}$ | $^{\text{0,6 сек}}$ ***setzt ein sichtbares `Zeichen*** $^{\text{3,8 скл/сек}}$ *gegen das Ver```gessen* $^{\text{6 скл/сек}}$. Паўза пасля ацэначнай лексемы рэалізуецца непаслядоўна : *Aber* ***wie ein `gut geöltes `Uhrwerk→*** $^{\text{5 скл/сек}}$ *sorgen `tausende Engagierte*$^{\text{5.2 скл/сек}}$ *allein in ``Deutschland dafür*$^{\text{4.1 скл/сек}}$, |$^{\text{0.5 сек}}$ *dass die Selbstreinigung* $^{\text{6 складоў, 4 скл/сек}}$ *funktioniert*$^{\text{4 скл/сек}}$ | $^{\text{0.3 сек}}$ *und nur ``das stehenbleibt* $^{\text{4.5 скл/сек}}$, |$^{\text{0.7 сек}}$ *was sich se`riös be```legen lässt*$^{\text{4.3 скл/сек}}$ .

Такім чынам, фразы з ацэначным лексічным кампанентам не характарызуюцца асаблівай прасодыяй, яны рэалізуюць прасадычныя асаблівасці, характэрныя для палітычнай мовы ў цэлым.